Л. М. БУРВІН
Івацэвічы, ДУА “Ліцэй Івацэвіцкага раёна”

РАЗВІЦЦЁ ЦІКАВАСЦІ ВУЧНЯЎ ДА ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ НА ІІІ СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Лічу, што няма ні аднаго настаўніка, які ў сваёй рабоце не выкарыстоўвае метады і прыёмы, што фарміруюць і развіваюць даследчыя кампетэнцыі вучняў. Проста нехта надае гэтаму аспекту многа ўвагі, а хтосьці – менш, але не абыходзіць зусім.

Я працую ў так званай установе новага тыпу. У асноўным тут займаюцца вучні з высокай матывацыяй да навучання, аднак з рознымі здольнасцямі да авалодання асобнымі прадметамі. Але ўсе яны вельмі цікавыя людзі, цікавыя ўжо ў сілу свайго ўзросту. Гэта перыяд ранняга юнацтва, цяпер у вучняў узнікае імкненне пазнаць свет і сваё месца ў ім, заявіць аб сабе як асобе. Аднак у гэтым узросце школьнікі ўсё ж застаюцца на ўзроўні сваёй падлеткавай субкультуры, у гэты перыяд узаемаадносіны вучняў з настаўнікам ладзяцца на прынцыпова іншым узроўні. Менавіта цяпер вырашаецца пытанне пра далейшае жыццё: адбываецца прафесійнае самавызначэнне, разам з якім часта назіраюцца і крызісныя моманты. Пры ўспрыманні і аналізе мастацкага твора старшакласнікі часта імкнуцца да арыгінальнасці, адкрытага выяўлення сваёй індывідуальнасці. Іх ужо не заўсёды задавальняе матэрыял падручніка, меркаванне настаўніка можа быць праігнараваным або ўспрынятым у штыкі. Таму лічу, што, працуючы ў старшых класах, немагчыма не заахвочваць вучняў да даследчай дзейнасці, таму што такі метад дапамагае вырашыць спрэчныя пытанні, бо “даследаваць – значыць падвергнуць навуковаму вывучэнню” [1,171], спрыяе развіццю навыкаў назірання, параўнання, аналізу моўных фактаў, абагульнення і г.д. Калі гаварыць пра даследаванні вучняў, неабходна адзначыць тое, што цяпер, асабліва на заключным этапе конкурсу вучнёўскіх работ даследчага характару, прапануюцца працы вельмі высокага ўзроўню, які прымушае не толькі вучня, але і настаўніка пастаянна вучыцца ў працэсе вучнёўскай даследчай дзейнасці.

Звернемся да прыкладаў. Урок літаратуры ў 10 класе. Тэма - “Міхась Зарэцкі”. Ці чулі, пытаюся ў вучняў, прозвішча такога пісьменніка. Чулі! Уключаю слайд з выказваннем чытача-аматара з інтэрнэтных крыніц: *“Цікава, але я чамусьці, калі бяру кнігу не знаёмага мне аўтара, заўсёды гляджу гады жыцця і асабліва гады смерці. 1937, 1938 гг. - ага, значыць, расстралялі. Дык вось і Зарэцкі такое ж «ага»! Цікава, але ні ў воднай яго кнізе я не знайшла нармальнай прадмовы. Здаецца, што ўсе*

ворагі народа, якія зусім былі не ворагі, а можна нават сказаць, палымяныя яго сябры, рэабілітаваны і надрукаваны, а літаратуразнаўцы і крытыкі нешта асцярожна маўчаць. Мне, чалавеку, які не вучыў у школе расстраляных аўтараў, цяжка, напрыклад, арыентавацца. Было б нядрэнна мець хоць якую дасведчаную думку аб ім. Пакуль прапаную сваю. Кінулася ў вочы асаблівае: слоўцы аўтара, такія як «нутро» - калі расказвае аб унутраных перажываннях, піша не «на сэрцы», а «ў нутры». Увогуле, рамантык рэвалюцыі, канешне... І адсюль - яго захапленне тэмай рэвалюцыі, смерці, любові, унутранай ломкі людзей". Ці падпішацеся вы пад гэтымі словамі, пытаюся. Далей – незвычайная біяграфія: вучыўся на свяшчэнніка, потым рэзка памяняў напрамак у жыцці – перапісчык, царкоўны вартаўнік, настаўнік… Як вы думаеце, пытаюся, калі аўтар змог так кардынальна змяніць свой лёс, якімі ж будуць героі яго твораў? На наступны ўрок слухаем вельмі цікавыя разважанні, зробленыя на аснове мікрадаследавання.

Яшчэ прыклад. Пры адказе на пытанне: "Што ж такое гэтае шчасце?" (па аповесці І.Шамякіна "Непаўторная вясна" са спісу для дадатковага чытання) вучань вывеў матэматычную формулу гэтага паняцця: *"Шчасце – гэта адсутнасць праблем. Давайце ўявім, што ёсць шчасце і яго максімум, да бясконцасці. "Чаму да бясконцасці?" – спытаеце вы. Я адкажу: мы ж не можам сказаць, што вось я максімальна шчаслівы. "Чаму не?" – зноў спытаеце вы. Я адкажу: напрыклад, дзяўчына ідзе па вуліцы, і яна лічыць, што яна максімальна шчаслівая. Але калі я падару ёй кветкі, шчанюка ці яшчэ што-небудзь, то шчасця ў яе прыбавіцца, хоць на адну мільярдную долю, але прыбавіцца. Такім чынам, С=1/(П+3)"*. А вучаніца зняла відэаролік, дзе людзі рознага ўзросту – ад выхаванцаў дзіцячага садка да пенсіянераў – адказвалі на вышэйзгаданае пытанне, яшчэ адна дзяўчына правяла даследчую работу "Як стаць шчаслівым: прапановы паэтаў і празаікаў Івацэвіччыны".

Наступны прыклад. Прыношу на ўрок пісьмовай творчай работы газеты. Адгортваю любую старонку, чытаю і запісваю на дошцы загалоўкі. Помнім, што ў загалоўку звычайна хаваецца тэма. "Які тэкст вы напісалі б пад гэтым загалоўкам? – гавару вучням. – Напішыце". Пішуць, а потым суадносім з аўтарскім. Пры параўнанні нехта ўбачыў у газеце памылку. Узялі нумары выдання за 3 месяцы, прааналізавалі, наведалі рэдакцыю, пагутарылі з рэдактарам, карэктарам, журналістамі. Вынік – даследчая работа "Раённая газета як крыніца вывучэння ступені захаванасці літаратурных норм у перыядычным друку". Матэрыял атрымаўся настолькі практычным, што потым я яго аформіла ў выглядзе плана-канспекта ўрока для 10 класа з павышаным узроўнем вывучэння

беларускай мовы і апублікавала на старонках часопіса “Беларуская мова і літаратура”.

Вельмі важна, лічу, вучыць дзяцей бачыць вакол сябе непрыкметнае. Жыву ў вёсцы Мілейкі, гэта радзіма Яраслава Пархуты, дом яго захаваўся ў тым жа выглядзе, аднак новыя гаспадары не дазваляюць мацаваць ніякія памятныя дошкі, бо не хочуць, як яны кажуць, жыць у музеі; за 3 км ад нас – вёска Сакоўцы – радзіма Піліпа Пестрака. На жаль, сучасным вучням гэтыя прозвішчы нічога не гавораць. Каля саменькага лесу дзясяткі гадоў стаіць стары мураваны будынак без аднаго акна. Неяк неасцярожна адзін вадзіцель закрануў вугал гэтага будынка, утварылася дзірка. А мама мая мне і кажа: “Парушылі кузню Пархутаў, Сільвестр (бацька пісьменніка) там каваў людзям родныя вырабы”. І нешта не па сабе зрабілася ад думкі, што рушыцца гісторыя. Тут жа прапанавала вучням зняць відэаэкскурсію па родных месцах Я.Пархуты і П.Пестрака. Знялі, агучылі, зрабілі тэкставую частку і на конкурсе даследчых работ атрымалі Дыплом 2 ступені ад часопіса “Роднае слова”, цяпер дзесяцікласнікі пры вывучэнні тэмы “Літаратура Заходняй Беларусі” здзяйсняюць завочную экскурсію.

Паступова, гледзячы на настаўніка, вучні прывучаюцца аналітычна ставіцца да ўсяго, што бачаць і чытаюць. Так, адной цікаўнай адзінаццацікласніцы патрапіліся на вочы словы невядомага інтэрнэтнага аўтара: “Горка ўсведамляць, але апошнім часам мы амаль развучыліся смяяцца. Хораша, шчыра, адкрыта. Знікае з твараў добразычлівая, лагодная ўсмешка, якой так не стае душы і сэрцу. Мы аддалі перавагу бяздарна злоснаму, цынічнаму смеху, які спараджае нянавісць, правіць свой знішчальны баль. Што з намі? Ці не значыць гэта, што мы ўшчэнт падрываем і без таго нягеглае маральнае здароўе. Прычыны? Безумоўна, яны ёсць: у кожнага, ва ўсіх разам — і дужа сур'ёзныя. Але чаму нам не стае сіл (няма ж іншага разумнага выйсця!) узняцца над імі, як гэта ўмеў некалі рабіць наш трывушчы жыццярадасны народ, здольнасць якога таленавіта і мудра смяяцца не змаглі вынішчыць самыя неспрыяльныя абставіны? Вось ужо і літаратура засведчыла гэтую нашую адчужанасць ад мудрага таленавітага смеху. Бо тое, што вельмі рэдка з'яўляюцца гумарыстычныя і сатырычныя творы, непажаданы, небяспечны для маральнага здароўя, але рэальны факт”. Не паверыла выказванню. Вынік - даследчая работа… І такіх прыкладаў можна прыводзіць вельмі многа.

Чула такое меркаванне, што арганізацыя даследчай дзейнасці з навучэнцамі — гэта не даніна модзе, а ўнутраная патрэба, захапленне, якім настаўнік зараджае сваіх выхаванцаў. Гэта праўда: ёсць у ёй нешта прыцягальнае, асабліва на апошняй ступені школьнай адукацыі, калі, на мой погляд, ступень самастойнасці вучняў самая высокая.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65000 слоў/ Пад рэд. М.Р.Судніка, М.Н.Крыўко. – 3-е выд. – Мн.: БелЭн, 2002. – 784 с.